ОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 249 (1216) || НЯДЗЕЛЯ, 26-га кастрычніка 1930 г.

ПРЭЧ З ПАРТЫІ
АГЭНТАЎ КЛЯСАВАГА ВОРАГА —НАЦЫЯНАЛ-ОПОРТУНІСТЫХ

астрычніцкая рэвалюцыя пад уніцтвам бальшавіцкае партыі цьцявіла на справе лёзунг самачэньня нацый і дала народам, ой прыгнечаным царызмам, магасьць свабоднага гаспадарчага і ыянальна-культурнага разьвіцьця ўмовах пролетарскай дыктатуры. кіраўніцтвам бальшавіцкае партыі, будуючы соцыялізм, мы ліквірэшткі фактычнае няроўнасьці, спадчыну старой царскай калёнінай політыкі.

адзнаку ад Заходняй Беларусі, я стогне пад окупанцкім ом польскага фашызму, Савецкая Беларусь, дзякуючы правай ленінскай політыцы, якую ацьцяўляе наша КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК, шпарка будуе соцыялізм, узмацняецца гаспадарча, ьпяхова будуе беларускую пролетарскую культуру. Колькі-б ні нацыянал-фашыстыя ды іх ьнікі—беларускія нацыянал-дэмократы, колькі-б ні кракалі нацыянал-опортуністыя ўсіх колераў, Р. крок за крокам, у абстаноўабвостранай клясавай барацьбы, анагаючы ўсе труднасьці, расьце е ў брацкай сям'і вызвалек народаў СССР. БССР прыцягда сябе ўзрастаючыя сымпатыі нечаных працоўных мас Зах. арусі і Польшчы.

Толькі правыя і нацыянал-опорістычныя элемэнты могуць ліць, што наша будаўніцтва можа ывацца без непрымірымай барацьбы супроць клясавага ворага, роць усіх шовінізмаў, якія акізуюцца, у сувязі з агульным абвостраньнем клясавай барацьбы. ькі гэроі нацыяналістычных тэай аб „самабытнасьці“, аб „адзіпрацоўнай нацыі“ могуць ліць за вышэйшае правіла сваіх одзін у адносінах да нацыянал-ократаў політыку настаянных упак, політыку братаньня і комісаў.

нас, у БССР, мы маем значажыўленьне ўсіх нацыяналізмаў рэзультат агульнага абвастраньня клясавай барацьбы, як рэзультат на-та соцыялістычнага наступленьня. алікадзяржаўны расійскі шовінізм, беларускі нацыянал-дэмократызм, рэйскі і польскі шовінізмы, маючы у супольную соцыяльна-клясавую, буржуазна-кулацкую базу, шалёна сувіцьцяўляюцца пабудове соцыялізму, нясе ім канчатковую гістарычю сьмерць.

Беларускі нацыянал-дэмократызм працягу ўсяго існаваньня БССР на адну хвіліну не выпускаў з зброі ў сваім актыўным змаганьні супроць пролетарскай дыктатуры. Зусім відавочна, што будаўніцтва БССР, што ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай політыкі магло працаваць толькі ў самай рашучай і рсткай барацьбе супроць беларускага нацыянал-дэмократызму, як супроць вялікадзяржаўнага і іншых шовінізмаў. Наш рух наперад г праходзіць і праходзіў не на нове ўступак клясаваму ворагу, гэтага хацелі і хочуць нацыянал-опортуністыя, не на падставе „якшаньня“ з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмократызмам, а на аснове клясавага змаганьня супроць ворага, на аснове мобілізацыі шырокіх працоўных мас пад кіраўніцтвам нашае партыі для гэтага змаганьня. У аснове бальшавіцкай нацыянальнай політыкі заўсёды ляжаў і ляжыць прынцып барацьбы з нацыяналізмам і з яго адбіткам унутры партыі, бо контр-рэволюцыйным лёзунгам адзінага нацыянальнага фронту буржуазія і яе ідэолёгі імкнуцца ўдарыць па адзіным рэволюцыйным фронце працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Актывізацыя шовінізмаў усіх колераў знаходзіць свае адлюстраваньне ўнутры партыі ў выглядзе актывізацыі нацыяналістычных ухілаў. Паасобныя элемэнты ўнутры нашае партыі, якія зышлі з ленінскіх прынцыпаў нашай політыкі, якія клясавае змаганьне супроць нацыянал-дэмократаў падмянілі саюзам з імі, братаньнем з клясавым ворагам, — зьяўляюцца агэнтурай гэтага ворага ў радох нашае партыі. Там, дзе гэтыя нацыянал-опортуністычныя элемэнты займалі на паасобных вучастках нашага гаспадарчага нацыянальна-культурнага будаўніцтва кіруючыя пасты, там мы мелі за апошні час рад сур'ёзных прарываў. Гэтыя прарывы мы мелі ў свой час у Наркомземе (прышчэпаўская хутарская політыка), мы іх мелі ў Наркомасьветы (Баліцкі), мы іх мелі ў Белдзяржвыдавецтве (Жылуновіч, Шыпіла), мы іх мелі і ў Беларускай Акадэміі Навук (Ігнатоўскі). Контр-рэволюцыйная нацыянал-дэмократыя жорстка змагаецца супроць пролетарскай дыктатуры. І ў гэтай барацьбе клясавы вораг, організуючыся, мобілізуючы ўсе свае сілы, імкнуўся праз сваю агэнтуру ў нашай партыі—нацыянал-опортуністых, узяць у свае рукі рад установаў. Пры непасрэднай дапамозе нацыянал-опортуністых, нацыянал-дэмократы ажыцьцяўлялі гэтыя свое контр-рэволюцыйныя пляны. Соцыяльная сутнасьць тых прарываў, якія ліквідаваны працоўнымі масамі БССР пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнае партыі і яе ЦК, заключаецца ў тым, што мы выкрылі і выцесьнілі на паасобных вучастках нашага будаўніцтва клясавага ворага і яго агэнтаў.

Нацыянал-опортуністычныя элемэнты ўнутры нашае партыі зьяўляліся простай зброяй у руках клясавага ворага, яго політычным рупарам, яго агэнтурай. Таксама, як і правыя опортуністыя ва ўсёй нашай партыі сталі прыцягваючым цэнтрам для кандрацьеўска-громанаўскай контр-рэволюцыі, для буржуазна-кулацкіх элемэнтаў усяго Саюзу, так і нацыянал-опортуністыя ўнутры КП(б)Б сталі прыцягваючым цэнтрам для беларускай контр-рэволюцыі. Паміж нацыянал-опортуністымі і нацыянал-дэмократамі сьцерліся ўсякія межы. Нацыянал-опортуністыя злучыліся ў сваёй барацьбе супроць бальшавіцкай політыкі нашае партыі з контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам. Гэтае змыканьне, гэтае чулае братаньне адбівалася і адбіваецца па ўсіх лініях. Нацыянал-опортуністычная дзейнасьць, нацыянал-опортуністычныя тэорыі Жылуновіча, Прышчэпава, Баліцкага, Ігнатоўскага і іншых былі выкананьнем праз іх соцыяльнага заказу беларускай контр-рэволюцыі. Тут трэба зусім выразна падкрэсьліць, што вялікадзяржаўны расійскі ўхілісты, польскі і яўрэйскі нацыянал-опортуністы сваёй дзейнасьцю, сваімі поглядамі выконваюць соцыяльны заказ клясавага ворага.

Прарывы былі якраз там, дзе гэтыя нацыянал-опортуністычныя элемэнты, заражаныя гангрэнай контр-рэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, на справе ажыцьцяўлялі сваю асобную нацыянал-дэмократычную політыку, проста процілеглую ленінскай політыцы нашае партыі.

Ва ўмовах соцыялістычнага наступленьня, якое разгортваецца пры нябывалым творчым энтузіязьме і ўздыме працоўных мас, калі гэты энтузіязм мільёнаў зьнішчае самыя вялікія і цяжкія перашкоды, партыя вяла і будзе цьвёрда весьці політыку самай бязьлітаснай барацьбы супроць тых, хто хоча павярнуць назад кола гісторыі.

Погляды нацыянал-опортуністых несумяшчальны з прабываньнем унутры партыі. Нацыянал-опортуністыя, зьяўляючыся агэнтурай контр-рэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, ды праваднікамі буржуазнай рэстаўрацыі, ні аднэй хвіліны ня могуць заставацца ў радох бальшавіцкае партыі. Партыя будзе бязьлітаснай да тых, хто аказаўся ў палоне ў нацыянал-дэмократаў, хто братаўся і „якшался“ з імі. Партыя будзе бязьлітаснай да тых, хто за яе сьпіной здраджваў інтарэсам партыі, здраджваў пролетарскай дыктатуры. У абстаноўцы тэй абвостранай барацьбы, якую мы вядзём не на жыцьцё, а на сьмерць супроць клясавых ворагаў унутры нашай краіны, супроць усяго міжнароднага імпэрыялізму, нацыянал-опортуністыя, як і права-опортуністыя, як і трацкістыя—зьяўляюцца агэнтамі ворага, якія імкнуцца падрываць нашу сілу ў радох рэволюцыйнай пролетарскай арміі. Ня можа быць ніякіх хістаньняў у барацьбе з гэтымі агэнтамі! Усякае прымірэнцтва, усякае пасобніцтва ім—гэта вада на млын контр-рэволюцыі.

Мы жывём у пэрыод, калі, дзякуючы правільнай бальшавіцкай політыцы нашае партыі, мільённыя масы з вялізарнейшай адданасьцю справе соцыялізму пераможна штурмуюць акопы старага сьвету. Ва ўсіх галінах будаўніцтва мы, наперакор опортуністычным элемэнтам, працуем бальшавіцкімі баявымі тэмпамі. Усякі, хто баіцца такіх тэмпаў, усякі, хто адстае ад іх, хто хныкае—адкідваецца ў бок жыцьцём.

Перад нашай партыяй стаіць задача зрабіць баявымі, сапраўды бальшавіцкімі, тэмпы ў галіне далейшага практычнага ажыцьцяўленьня нашай нацыянальнай політыкі. **Мы ажыцьцяўлялі і ажыцьцяўляем правільную нацыянальную політыку.** Наша задача заключаецца ў тым, каб хутка ліквідаваць тыя паасобныя прарывы, якія ёсьць на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва, каб на-баявому зьнішчыць недахопы ў гэтай галіне. Партыйныя організацыі павінны зьвярнуць значна больш увагі на ўзмацненьне тэмпаў барацьбы за правядзеньне беларусізацыі, за павышэньне **якасьці** нашае працы па беларусізацыі, за рашучую барацьбу супроць вялікадзяржаўна-шовіністычных элемэнтаў, якія супраціўляюцца беларусізацыі. Трэба, каб усе партыйныя організацыі з яшчэ большай актыўнасьцю кіравалі ўсім нацыянальна-культурным будаўніцтвам. Трэба скончыць з тымі паасобнымі праявамі пасыўнасьці, а часам нэйтральнасьці ў пытаньнях кіраўніцтва разьвіцьцём беларускай пролетарскай культуры.

Як важнейшая, як першачарговая задача, высоўваецца задача па вылучэньню і карэнізацыі новых пролетарскіх кадраў. Аднэй з прычын, і немалаважных, тых прарываў, якія мы мелі, зьяўляецца слабасьць нашых кадраў. Нацыянал-опортуністыя ўсімі сіламі тармазілі і тармозяць гэта вылучэньне новых кадраў. Яны і іх гаспадары—нацыянал-дэмократы — імкнуліся трымаць монополію ў сваіх руках па цэлым радзе вучасткаў нашага будаўніцтва. Пасьпяховае змаганьне супроць нацыянал-опортуністых і нацыянал-дэмократаў усіх колераў патрабуе значнай актывізацыі і значнага ўзмацненьня працы па вылучэньню карэнных пролетарскіх кадраў. Гэта—глыбока політычная задача ўсёе партыі зьверху да нізу. Вырашэньне, напрыклад, такой задачы, як кіраўніцтва Акадэміяй Навук, непасрэдна і шчыльна зьвязана з проблемай кадраў. І тут патрэбна барацьба супроць закасьцянеласьці, супроць опортуністычных адносін да вырашэньня проблемы кадраў.

Ажыцьцяўляючы бальшавіцкую політыку соцыялістычнага будаўніцтва, партыя наша, на чале са сваім ЦК, будзе весьці БССР па шляху ўсё новых і новых перамог, ліквідуючы рэшткі фактычнае няроўнасьці. Пры ажыцьцяўленьні гэтай політыкі партыя будзе змагацца з усімі нацыяналістычнымі ўхіламі ад генэральнай лініі, з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам, як галоўнай небясьпекай, з беларускім нацыянал-дэмократызмам, а таксама з нацыяналізмамі ўсіх адценьняў.

„ЗЬВЯЗДА“

Інформацыйнае паведамленьне

20-25 кастрычніка адбыўся 2-гі пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б 13-га скліканьня з удзелам сэкратароў гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі.

На павестцы дню пленуму стаялі наступныя пытаньні: 1) аб чарговых гаспадарчых задачах; 2) аб узмацненьні раёнаў у зьвязку з ліквідацыяй акруг і 3) аб нацыянальным пытаньні. Па ўсіх гэтых пытаньнях пленум ухваліў рэзолюцыі, якія будуць надрукаваны.

Пленум пастанавіў адкамандыраваць пад загад ЦК УсеКП(б) другога сэкратара ЦК КП(б)Б—тав. **ВАСІЛЕВІЧА.**

У зьвязку з грубымі скрыўленьнямі партыйнай лініі, якія дапушчаны тав. **ІГНАТОЎСКІМ** *у часе яго работы ў Акадэміі Навук, пленум пастанавіў вывесьці тав. Ігнатоўскага са складу ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б і зьвярнуўся ў Цэнтральную Кантрольную Камісію КП(б)Б з просьбай разглядзець пытаньне аб магчымасьці далейшага знаходжаньня тав. Ігнатоўскага ў партыі.*

Пленум пастанавіў каоптаваць у склад Цэнтральнага Камітэту тав. **ШАРАНГОВІЧА,** *абраўшы яго членам Бюро і* **другім сэкратаром Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.**

Пленум пастанавіў перавесьці з кандыдатаў у члены Бюро ЦК тав. **ХЛЕЎНІКАВА** *і абраў у члены Бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав.* **БУДЗІНСКАГА,** *прызначыўшы яго* **адказным рэдактарам ЦО—газэты „Зьвязда“.**

Усім організацыям УсеЛКСМ

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў правядзеньні XIII гадавіны Кастрычніка

1. Актыўны ўдзел організацый УсеЛКСМ у падрыхтоўцы і правядзеньні XIII гадавіны Кастрычніка павінна прайсьці пад лёзунгамі выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, кантрольных лічбаў асобага ўдарнага кварталу, выкананьня дырэктыў партыі ў галіне колектывізацыі, правядзеньня гаспадарча-політычных задач (асеньні сеў, хлебазагатоўкі, мобілізацыя грашовых рэсурсаў), умацаваньня саветаў—органаў пролетарскай дыктатуры, задач у галіне ўсеабучу і політэхнізацыі, яшчэ большага згуртаваньня комсамолу вакол партыі і рашучай барацьбы за генэральную лінію.

2. Організаваць на прадпрыемствах і ў вёсках гутаркі, вечары, прысьвечаныя популярызацыі рашэньняў XVI партзьезду, дасягненьняў савецкай улады і партыі ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва і вынікаў другога году пяцігодкі, падкрэсьліўшы значэньне Кастрычніцкай рэволюцыі ў вызваленьні прыгнечаных нацыянальнасьцяй і посьпехі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

3. Прапанаваць усім комсамольскім організацыям, у сувязі з XIII гадавінай Кастрычніка, разгарнуць шырокую вярбоўку рабочае моладзі ва ўдарныя брыгады, організуючы новыя ўдарныя брыгады імя XIII гадавіны Кастрычніка, праводзячы суботнікі і падрыхтоўку падарункаў да гадавіны Кастрычніка.

Паставіць асоба перад усімі вясковымі організацыямі задачу датэрміновага выкананьня пляну хлебазагатовак, організацыі чырвоных хлебных абозаў да XIII гадавіны.

Разгарнуць шырокую вярбоўку рабочай, батрацка-бядняцкай і лепшай перадавое колгаснае моладзі ў комсамол.

4. Правесьці масавую праверку работы комсамолу ў саветах; у гэтых мэтах організаваць справаздачы комсамольцаў перад абіральнікамі на сходах рабочай, працоўнай моладзі і на адкрытых сходах комсамольскіх ячэек. Абавязваць друк комсамолу сыстэматычна асьвятляць ход гэтай работы.

Зьвязаць падрыхтоўку да сьвяткаваньня гадавіны з шырокай падрыхтоўкай да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, умацаваньнем савапарату кадрамі комсамольцаў і моладзі.

Правесьці вылучэньне комсамольцаў і моладзі на кіруючую работу ў органы саветаў і дзяржапарат. Рэкамендаваць прэміяваньне груп лёгкай кавалерыі, якія праявілі сябе найбольш актыўнымі ў чыстцы дзяржапарату і ўмацаваньні саветаў.

5. Адзначыць сьвяткаваньне XIII гадавіны закладкай і адкрыцьцём соцыяльна-культурных установаў (дамы рабочае моладзі, клюбы, школы, аздароўчыя калёніі і інш.).

6. Організацыі комсамолу павінны прыняць меры да найбольш маляўнічага правядзеньня Кастрычнікавай гадавіны, мобілізаваўшы ўсе сродкі мастацка-політычнай агітацыі, прыняўшы ўдзел у падрыхтоўцы і найбольш яркім і маляўнічым правядзеньні кастрычнікаўскіх карнавалаў і дэмонстрацый.

БАРАЦЬБА ЗА СЬЦЯГІ — социялістычнае спаборніцтва СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

Становішча разгортваньня барацьбы за сьцягі прымушае біць трывогу. Комсамольскія організацыі на мясцох ня сталі на чале барацьбы за выкананьне прамфінплянаў — аўладаньне ганаровымі сьцягамі

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ВЫКАРЫСТАЦЬ ЗАСТАЎШЫЯСЯ 5 ДЗЁН

ТОЛЬКІ 5 ДЗЕН

К канцу другога году пяцігодкі наша прамысловасьць прышла з некаторым недавыкананьнем прамфінпляну, якое надзвычайна дрэнна адбіваецца на далейшым ходзе нашага будаўніцтва.

Трэці год пяцігодкі павінен быць годам яшчэ большага наступу па фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Трэці год павінен даць 7,5 мільёнаў тон чыгуну, 74,5 мільёнаў тон вугалю, на 2,5 мільярдаў руб. новых машын, на 845 мільёнаў рублёў сельска-гаспадарчых машын. Гэты гіганцкі размах будаўніцтва патрабуе ад нас, каб да 3-га году пяцігодкі мы прышлі зусім падрыхтаванымі і за час пятага, ударнага кварталу, поўнасьцю ліквідавалі прарыў, які ў нас меўся.

Па ініцыятыве „Праўды“ якая была падхоплена і шэрагам іншых газэт расьпачаты ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства, які павінен па ўдарнаму выканаць плян ударнага кварталу і ліквідаваць заняпаданасьць за другі год.

Канчатковым тэрмінам уключэньня ў конкурс устаноўлена 1 лістапада. Да гэтага часу ўсе прадпрыемствы павінны ўключыцца ў конкурс з тым, каб, пасьпяхова выканаўшы прамфінплян, лепш паставіць працу прадпрыемства, атрымаць першынства ў гэтым соцыялістычным спаборніцтве прадпрыемстваў Савецкага Саюзу.

Адначасова з гэтым, ЦК КП(б)Б вынес пастанову аб выпуску трох ганаровых пераходных сьцягоў імя ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ, якія будуць перададзены лепшым прадпрыемствам Беларусі, падаўшым найбольшыя паказчыкі ў выкананьні прамфінпляну і лепшую падрыхтоўку да трэцяга году пяцігодкі.

Трэба адзначыць пры гэтым непаваротнасьць, якая існуе яшчэ на некаторых прадпрыемствах і ў комсамольскіх колектывах. Комсамол, які зьяўляецца ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва, творцам батальёнаў энтузіястых, барацьбітом за прамфінплян, у конкурсе за сьцягі ня выявіў свайго твару, ня стаў на чале барацьбы за прамфінплян і ўдзел у конкурсе.

Зьмяшчаемы сёньня матар'ял з месц прыводзіць факты падобнай нярухавасьці.

У Менску, на заводзе „Бальшавік“, пачаліся вытворчыя манэўры, але без належнага кіраўніцтва, яны былі сарваны. На іншых прадпрыемствах, якія яшчэ ня ўключыліся ў конкурс, таксама не вядзецца ніякай барацьбы за зьнішчэньне недахопаў вытворчасьці, за рацыяналізацыю і зьнішчэньне страт на вытворчасьці.

Да 1 лістапада засталося 5 дзён. За гэтыя дні неабходна навярстаць упушчанае, безадкладна ўключыцца ў конкурс і разгарнуць працу вакол барацьбы за аўладаньне сьцягам, пасьпяхова выконваючы прамфінплян. Комсамольскай організацыі неабходна ўключыцца ў конкурс з тым, каб, стаўшы на чале ўдарніцкага руху, весьці працоўную моладзь на барацьбу за выкананьне пляпаў ударнага кварталу і падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі, на барацьбу супроць тых кіраўнікоў, якія ня здольны быць на чале працоўных мас і сваімі опортуністычнымі дзеяньнямі зрываюць гэтую важнейшую палітычную кампанію.

Засталіся лічаныя дні. Гэтыя дні павінны быць рацыянальна скарыстаны.

УСЕ ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

24 кастрычніка а 6-й гадзіне раніцы на фабрыцы „Кастрычнік“ (Менск) мітынгам рабочых абвешчаны вытворчыя манэўры.

Рабочыя фабрыкі з вялікім энтузіязмам сустрэлі гэтае мерапрыемства.

Усе прыведзены ў баявы парадак.

Генэральны штаб манэўраў прыступіў да рэалізацыі выпрацаванага конкрэтнага пляну на час манэўраў.

Рабочыя запэўніваюць, што яны прыкладуць усе сілы, каб выканаць прамфінплян, атрымаць сьцяг лепшага прадпрыемства.

Будуем гіганты-заводы

На здымку: адна з домн Краматорскага мэталюргічнага заводу

Глохне ініцыятыва

Вытворчыя манэўры зрываюцца

5-га кастрычніка завод „Бальшавік“ уступіў у вытворчыя манэўры.

Былі організаваны заводзкі і цэхавыя штабы кіраўніцтва манэўрамі, штабы ў сваю чаргу арганізавалі брыгады па праверцы якасьці продукцыі, зьніжэньня сабекошту, становішча ўдарніцтва і г. д.

Комсамольскі колектыў таксама абвясьціў сябе мобілізаваным, адпрацаваў некалькі выхадных дзён для ліквідацыі прарыву і абвясьціў збор рабочых прапаноў. Але ўся гэтая работа да канца не даведзена. Штаб ужо склаў сваё аружжа, а комсамольскі колектыў нічога ня робіць для ажыўленьня работы.

Партыйна-профэсыйныя організацыі заводу зусім ня кіруюць вытворчымі манэўрамі.

Добрыя, карысныя пачынаньні на заводзе „Бальшавік“ глохнуць.

З. Мінкін.

Стаць на чале мас

Рабочыя Лесазаводу „Пролетары“ (м. Старыя Дарогі) выканалі свой прамфінплян на 112,3 проц. Калі ў мінулым годзе меліся прарывы, дык выкананьнем прамфінпляну гэтага году рабочыя сваю запазычанасьць ліквідавалі. Замест патрэбных па пляну 18583 к-м расьпілавана 21200 кубамэтраў драўніны. Сабекошт выпусканай продукцыі зьнізіўся на 18 проц. Вытворчасьць працы ўзьнялася на 22 проц.

Здавалася-б, што пры такім становішчы кіраўніцтва заводу павінна было-б організаваць сустрэчны прамфінплян на 3-ці год пяцігодкі са значна павышанымі паказчыкамі, але габінэтчыкі „яшчэ толькі думаюць яго выпрацаваць“.

Зборам рабочых прапаноў ніхто не займаецца, ініцыятыва рабочых хаваецца ў бюрократычных халодных габінэтах. За апошнія месяцы значна павялічыліся прагулы і лятунства. Так, у маі месяцы быў адзін прагул, у жніўні—10, а ў верасьні—6. Рабочыя Галуза, Зарубайка, Кудзелька, Федасеенка лётаюць з заводу на завод, і ніхто ім у гэтым не перашкаджае.

Ударніцтва на заводзе фактычна няма, бо ім ніхто ня кіруе. Паасобныя рабочыя, абвясьціўшы сябе ўдарнікамі, не апраўдалі гэтай назвы.

Партыйна-профэсыйныя, комсамольскія організацыі павінны павесьці рашучую барацьбу з такімі зьявамі, каб у час ударнага кварталу падрыхтавацца да 3-га году пяцігодкі. Комсамольскай ячэйкі на заводзе не адчуваецца, яна не павярнулася тварам да вытворчасьці, што значна адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

МІКОЛА ШВАНКОЎ.

У бой за бальшавіцкія тэмпы

(Менск „Комунарка“)

Хрыпла і слаба пракрычала сырэна.

Але ўсе ўжо на сваіх мясцох. Кожны за сваім варштатам. Заклапочаныя твары. Ня чуваць непатрэбных гутарак—ворагаў прамфінпляну, тормазаў ударных тэмпаў.

А слова „тэмпы“—у кожнага на вуснах.

Фабрыка „Комунарка“ ўключылася ва ўсебеларускі конкурс на пераходны сьцяг, абвясьціла трохмесячныя вытворчыя манэўры наперакор малаверам тыпу тав. Хобада—сябра бюро колектыву ЛКСМБ, які на рабкораўскай нарадзе выступаў супроць доўгатэрміновых манэўраў, прарокуючы ім поўны правал.

Але аднадушны адпор быў яму адказам. Уся рабкораўская маса прызнала трохмесячныя манэўры патрэбнымі і мэтазгоднымі. Усе рабкоры самамобілізаваліся.

Манэўры ўскалыхнулі ўсю фабрыку, залілі яе непераможным шквалам працоўнага энтузіязму.

Абвешчана вайна стратам, прагульшчыкам і лятунам. Кожны сачыць сам за сабой і за другім. Новы, толькі паступіўшы на фабрыку, рабочы Клімашэвіч, біручы для забойкі скрынку з цукеркамі, рассыпаў крыху і не сабраў. Малады ўдарнік Трэсман, заўважыўшы гэта, падышоў і ціха напярэдзіў: „Таварыш, трэба сабраць, ты зрываеш змаганьне са стратамі. Не забудь, што ты працуеш на ўдарнай фабрыцы“. Па-гаспадарску, як да сваёй кроўнай справы, стаў адносіцца да працы Клімашэвіч.

Прагульшчыкаў абкружаюць ненавісьцю, над імі організуецца суд, вывешваюць у кожным цэху плякат з прозьвішчамі прагульшчыкаў, якія зрываюць выкананьне прамфінпляну.

Штаб кіраўніцтва манэўрамі мае пры кожным цэху разьведчыкаў.

Шматтыражка—„Комунарка на манэўрах“ кожны дзень паведамляе рабочых аб ходзе манэўраў.

Абвешчан конкурс на пераходны ўнутрыфабрычны сьцяг.

Ужо зараз, загадзя, намячаюцца тэмпы да трэцяга году пяцігодкі. Так, варачны цэх добраахвотна ўзьняў норму выпрацоўкі на 25 пр.

Рабкоры не адстаюць ад тэмпаў фабрыкі. Абрана новая, больш баяздольная рэдколегія. Пры кожным цэху існуюць рабкораўскія пасты, організаваны ўдарныя рабкораўскія брыгады. Паміж брыгадамі і паасобнымі рабкорамі заключана соцспаборніцтва на лепшае асьвятленьне ходу манэўраў.

Уся гэта праца непарыўна зьвязана з культурна-масавай. Выпушчаюцца сьценавыя і вусныя газэты, прысьвечаныя ходу манэўраў.

Ад забясьпечаньня фабрыкі сыравінай залежаць посьпехі манэўраў. Таму за сыравіну вядзецца асаблівая барацьба.

Узята на буксір праца фабзавучу—кузьні кадраў для новай фабрыкі.

Л. Субач.

Аб конкурсе і ня думаюць

Тэхнічны пэрсонал заводу „Кастрычнік“ амаль не аддае ўвагі асноўнаму зьвяну заводу — печы. Частыя прастоі печы ўплываюць на невыкананьне прамфінпляну.

На працягу 7-мі месяцаў прагарэўшая лодка ў ванне печы, ле даўно патрэбна было зьмяніць, а тэхпэрсанал і ў „вус не дуў“. Апомніліся толькі тады, калі завод спыніў працу.

Такія факты сустракаюцца часта. Тэхнічны пэрсонал абвясьціў сябе мобілізаваным. Але гэта мобілізацыя адчуваецца толькі на паперы.

Юнкорбрыгада— Працкевіч, Плешынгер, ...

Узятыя абавязкі выканаем

Фабрыка „Беларуска“ за першае паўгодзьдзе 29-30 г. мела значны прарыў. Гэта здарылася дзякуючы безгаспадарнасьці, якая панавала на фабрыцы пры яе старым кіраўніцтве. Пасьля зьмены опортуністычнага кіраўніцтва работа ў трэцім і чацьвёртым квартале фабрыка пайшла ўперад.

Грамадзкія організацыі фабрыкі здолелі сваёй масавай працай мобілізаваць усіх рабочых на ліквідацыю прарыву. У выніку—сустрэчны прамфінплян перавысіў плян адміністрацыі на 30 проц. Рабочымі ўнесена 140 прапаноў. Але, нягледзячы на ўсё гэта, другі год пяцігодкі мы скончылі са значным прарывам. Прамфінплян быў выкананы на 89,6 проц.

Асобны квартал павінен паказаць гэты недахоп, і ў гэтым напрамку мы маем ужо некаторыя дасягненьні. Так, 1-ая дэкада кастрычніка дала выкананьне прамфінпляну 101,3 проц., другая дэкада 108,4 проц., гэта—нягледзячы на недахоп сыравіны ў гузічным цэху.

Зараз пачынаецца правядзеньне вытворчых манэўраў на фабрыцы, абраны штаб з прадстаўнікоў адміністрацыі, грамадзкіх організацый і ўдарнікаў у ліку 8 асоб, які ўжо прыступіў да працы.

Рабочы колектыў фабрыкі „Беларуска“ пад кіраўніцтвам партыйна-комсамольскіх і профэсыйных організацый, нягледзячы на цяжкасьці ў забясьпечаньні сыравінай, узятыя на сябе абавязкі па сустрэчнаму прамфінпляну выканае з такім разьлікам, каб у час ударнага кварталу пакрыць прарыў году пяцігодкі і з новымі перамогамі на гаспадарчым фронце сустрэць 3-ці год пяцігодкі.

ПАСТАЛЬ...

Дрэнна скарыстоўваюць рабочую сілу

На Барысаўскай электростанцыі комбінату часта не хапае слесароў для правядзеньня тэрміновых рамонтаў, што выклікае значныя прастоі.

Адміністрацыя выкарыстоўвае кваліфікаваных сьлесароў 5-га і 6-га разраду на падвозцы ..., матывуючы адсутнасьцю чорнарабочай сілы.

Чорнарабочая сіла ёсьць, але ніхто з гаспадарнікаў не падумаў аб устанаўленьні цьвёрдай стаўкі спэцвопраткі для яе.

Завком і насьценгазэта неаднакроць сыгналізавала аб гэтым, але адміністрацыя гэтым пытаньнем не займаецца.

БОРАВ...

НА ПЛЕНУМЕ ЦБ ДКО

Комсамол не кіраваў піонэрарганізацыяй

Сутнічаньне з боку комсамолу кіраўніцтва і практычнай дапамогі піонэрарганізацыі, недаацэнка па шэрагу мейсц яе палітычнай ролі ў справе соцыялістычнага будаўніцтва—прывялі да глыбокага палітычнага прарыву ў становішчы і рабоце ДКО Беларусі

Мобілізаваць увагу ўсёй арганізацыі ЛКСМБ і працоўнай грамадзкасьці на ліквідацыю прарыва. Рашуча ўдарыць па недаацэнцы піонэрарганізацыі, забясьпечыўшы неадкладны станоўчы пералом

(Спрэчкі па дакладу тав. Прахвацілава аб становішчы ДКО Беларусі)

5 хвілін для дакладу

...штэйн (Віцебск). Першыя вынікі ...следваньня работы піонэраў далі ...торы штуршок рабоце. Ка і ня ...е рашучага пераломy з боку гра...касьці і КСМ, дык нічога ня вый...

Прывяду характэрны факт. Ком...льскі колектыў Віцебскай панчош...фабрыкі, праводзячы культэстафэ...рашыў уцягнуць піонэраў толькі ...а маршруты — політэхнізацыі і ...гульнага навучаньня, рэшта марш...ў будзе праводзіцца колектывам ... Вось як піонэрарганізацыі пры...нюцца да ўдзелу ў праводзімых ...прыемствах. Такіх выпадкаў у ...шмат.

...базе МББ, адной з буйней... ...Беларусі, дзе налічваецца ...ш 1000 піонэраў, мы мелі абу...ны факт. Зусім нядаўна быў за...ны сход, на які замест 1200 піо...у сабралася толькі 76 чалавек.

...нас, у Віцебску, на бюро РК ...МБ 4 разы ставілася справаздача ...ых піонэрарганізацый і 4 разы ...адалася, бо знаходзіліся больш ...ныя пытаньні.

...лі ня выклікаюць у партколек... і даюць па рэгламанту 5 хвілін ...дакладу, мы кажам:—драннае ста...ча, выручайце! За 5 хвілін больш ...аць нельга. Загадзя пішацца рэ...цыя і апытаньнем яе прапуска...

...нас працуюць партыйцы кіраўні...фарпостаў. Некаторыя з іх за...ў 3-х фарпостах і атрымоўваюць ...кі 75 руб. Мы мелі ў 17 сямігод...кую зьву, калі 7 і 6 ударныя ... адмовіліся ехаць на працу ў ...

...мелі шэраг кон рэволюцыйных ...упленьняў школьнікаў супроць ...кі індустрыялізацыі, супроць збо...родкаў на дырыжабль „Праўда“, ...гэтыя выступленьні не атрымліва...рашучага адпору.

...прытульныя акцябраты

...цкін.—Наша піонэрская арганіза...ня ўдзельнічае ва ўсіх праводзі...партыяй кампаніях. ЦБ у адно...к работы з акцябратамі зусім ві...не рабіла. У мяне ёсьць такія ...скі, што ў ЦБ няма нават работ...на працы з акцябратамі.

...фества ў піонэр-рганізацыях мае ...ама вялікае значэньне. Я прапаста...каштарыс у РВК, каб адпусьцілі ...ы на правядзеньне курсаў і вы...ў літаратуры, дык РВК чырвоным ...нтам паставіў крыж. Трэба да...а праз ЦВК, каб пастановы выпе...ня зьлётам былі выканаваны нашымі ...новамі.

...артыйныя арганізацыі шэрагу месц ...кавіцца піонэр працай. За ўвесь ...насей працы ні адна партыйная ...ка не заслухала справаздачы пра...ра атраду на паседжаньні бюро ...кі. Тое самае можна сказаць і ...комсамольскіх ячэйках. Прыяж...о ў адну ячэйку і пытаюся: „Хто ў ...павадыр атраду?“ Мне адказваюць ...„Ня ведаем“. Мы пачалі рыцца ў ...аколах і знашлі, што такі-та ком...олец зьяўляецца павадыром атраду.

...пер—аб пісьмовым кіраўніцтве ...ДКО. На вялікі жаль, я не захапіў ...бою цыркуляраў, якія нам дась... ЦБ, але калі-б прымусіць увесь ...ум і само ЦБ прачытаць іх, дык ...-б і неразабраўся. Я надзяваў аку...ы і браў павялічальнае шкло, але ...та не зразумеў.

...Б, прысылаючы пратаколы ў РБ, ...а так: слухалі такое-та пытаньне. ...астанова прыкладаецца. Я перарыў ...сь пакет, а пастановы няма. Аказ...шча, пастанова засталася ў ЦБ.

...б распрацоўцы адозвы ЦК Усе...(б) ЦБ прыслала рэзолюцыю аку...праз месяц, калі ўжо заслухалі ...лад Фрунзэўскага і Барысаўскага ...комаў аб прапрацоўцы адозвы ЦК ...КП(б).

...У Гомель прыехаў прадстаўнік, ...зрабіў абсьледваньне, а з ...шкамі нас не пазнаёміў, адаслаўшы ...тар'ялы ў ЦБ. Уся піонэрская арга...цыя таксама ня ведала аб вы...ах.

...а агляду не падрыхтаваліся

...ухцігер:—Ня гледзячы на некато...я посьпехі і дасягненьні, піонэр...ганізацыя Беларусі ў асноўным зна...дзіцца ў цяжкім становішчы.

...З прычыны таго, што мы ня маем ...ежных павадыроў, былі выпадкі, ...і піонэры лепшых піонэр-атрадаў ...най арганізацыі палілі гальштукі, ...водзілі контр-рэволюцыйныя вы...ступленьні.

Пры аглядзе піонэрарганізацыі Беларусі, раённы камітэт не паведаміў, што буд е праводзіцца агляд і трэба мобілізаваць грамадзкасьць па агляду.

Уключыцца ў колгаснае будаўніцтва

Галкова: Працу атрадаў трэба перанесьці у колгасы, прымацаваць атрады да паасобных галін колгаснай гаспадарк, напрыклад да жывёлагадоўлі і г. д. Трэба, каб кожнае зьвяно ўдзельнічала ў працы колгасу.

Для таго, каб піонэрскія атрады і наогул дзетвара прынялі лепшы ўдзел у гаспадарча палітычных мерапрыемствах і асабліва ў коле тывізацыі, трэба арганізаваць групы садзейнічаньня і вярбоўкі ў колгасы. Прымацаваныя да вёсак піонэры павінн агітаваць шляхам культурнай працы і давесьці перавагу колгасаў над адзінаасобнымі гаспадаркамі.

У нас ёсьць атрады, якія сваімі сіламі арганізавалі чырвоныя абозы.

Неабходна абавязкова перабудаваць працу Райдзетбюро. Трэба больш наблізіць масы да жывой практычнай работы.

У нас дрэнна пастаўлена інтэрнацыянальная праца, ёсьць праявы антысэмітызму і г. д. Часта павадыры ня могуць як сьлед растлумачыць хлопцам сутнасьць антысэмітызму, шкоднасьць яго і г. д.

Цяжкае становішча з кіраўніцтвам не азначае наліччa крызісу актыўнасьці ДКО

Пэрліна.—До рыя справы, якія мы мелі на мінулым пленуме, пасьля зьлёту, нашай піонэрскай арганізацыяй не замацаваны. Гэта значыць, што большасьць піонэрскіх арганізацый ня прымала штодзённага, практычнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. У нашай піонэрскай ор анізацыі выпала гэта асноўнае зьвяно комуністычнага выхаваньня. Калі мы сёньня гаворым аб прычынах і займаемся падчас самабічаваньнем, то павінны, безумоўна, сказаць, што асноўная прычына заложана ў сыстэме нашага кіраўніцтва.

У летні пэрыод было проста жудаснае становішча, на працягу 4-5 месяцаў наша ЦБ піонэраў заставалася без работнікаў. Правільна адзначыла бюро ЦК комсамолу, што віною тут не об'ектыўныя прычыны, а непатрабаваньне адказнасьці ад камітэтаў за становішча нашай арганізацыі.

Ці можам мы кваліфікаваць становішча як крызіс. Не, гэта было-б памылкаю. У нас цяжкое ст новішча з кіраўніцтвам, але паніжэньня актыўнасьці піонэрскай арганізацыі мы ня маем. У піонэрскай арганізацыі ёсьць і ініцыятыва і актыўнасьць, але яны падчас не накіраваны ў патрэбнае рэчышча, а часам знаходзяцца нават пад шкодным уплывам. Ад правільнай ацэнкі таго, што мы маем зараз, залежыць наш далейшы пералом.

Прэзыдыум ЦБ пастанавіў правесьці яшчэ адзін агляд. Зразумела, што той агляд, які быў праведзены ЦБ ЦК ВК ЛКСМ, ня мог ахапіць усе раёны. Гэты агляд дапамог у асноўным праверыць нашу работу, каб мобілізаваць арганізацыю на выкананьне асноўных задач.

У шмат раёнах нават няма старшыні Райбюро. Мы зараз будзем правярась усе кадры па лініі Райбюро і па лініі павадыроў разам з Райбюро і камітэтамі комсамолу мы павінны гэтую работу правесьці.

Нашы піонэрскія газэты—„Піонэр Беларусі“ і „Юнгер Ленінец“ мобілізуюць увагу навакол асноўных задач, якія стаяць перад намі. Зараз перад намі як ніколі паўстае задача выкрыць конкрэтных носьбітаў зла. У нас маюцца выпадкі, калі на сыгналізацыю ня толькі піонэрскіх, але і іншых газэт не зьвяртаюць увагу.

Нам трэба на што-б там ні было разам з комсамолам даваць рашучы адпор такой недаацэнцы ролі друку.

Актыўнасьць не скарыстоўваецца

Шпіцэр:—(„Піонэр Беларусі“) — у вывадах па агляду піонэр-арганізацыі ясна сказана, што ў піонэрскай арганізацыі маецца шэраг прарываў, што ня ўся арганізацыя пераключылася да ўдзелу у соцыялістычным будаўніцтве. Гэты факт нам усім ясны.

Дзейнасць у нашых піонэр-арганізацыях мае месца. Нашы павадыры ня ўключылі арганізацыю для ўдзелу

ў той рабоце, якую праводзіць штодзённа фабком, профсаюзы і комсамольская ячэйка.

Мы ня можам казаць, што ў піонэр арганізацыях няма павароту. Ён маецца. Возьмем некаторыя піонэрскія арганізацыі Беларусі. Яны мобілізавалі сябе на асеньнюю пасяўную кампанію і іншыя гаспадарчыя кампаніі.

Старшыні райбюро ў большасьці ня чытаюць „Піонэра Беларусі“. Калі нашы старшыні РБ чыталі, яны-б ведалі, што робіцца ў арганізацыі. Піонэры даюць дасканалы твар нашых старшынь РБ. Яны пішуць аб тым, што старшыні РБ нічога не робяць.

Усё тое, што намі завайстраецца,—зачастую райбюро не падхопліваюць.

Пакуль старшыні РБ не скарыстаюць актыўнасьці дзеячых арганізацый у нас недахопы будуць.

Без комсамольскага кіраўніцтва

Мэрголін (Віцебск). Цэнтральны Камітэт комсамолу, як і ўся комсамольская арганізацыя, нічога не зрабіў, каб палепшыць наша кіраўніцтва і работу. На сёньня мы маем такое становішча, што ў піонэрскай арганізацыі калі і працуюць, дык толькі адзінкі.

Трэба сказаць, што калі і ў далейшым з боку ЦК комсамолу ня будзе ўжыта ніякіх мер да палепшаньня работы піонэрскай арганізацыі, дык работа не кранецца з мёртвага пункту

У Віцебску з 100 мобілізованых на піонэрпрацу засталося зараз толькі 20 чалавек, той факт, што ніхто ня зьняты за дрэнную работу, не атрымаў спаганяньняў гаворыць аб недаацэнцы піонэрскага руху.

Сёньнешні пленум павінен завастрыць увагу на стан кіраўніцтва комсамольскіх арганізацый. Мы ведаем, што ў нас, у Віцебску, два гады таму назад была дрэнна пастаўлена самакрытыка, але цяпер мы дабіліся, што самакрытыка зьяўляецца адной з асноўных мер у барацьбе за ўцягненьне ў работу. І трэба прыцягнуць да адказнасьці тых кіраўнікоў, якія недаацэньваюць гэтага пытаньня.

Кадры—вузкае месца

Левін.—Вялікай перашкодай зьяўляецца недахоп кадраў. Мы маем прыклады, калі піонэратрадамі кіруюць беспартыйныя. У шмат піонэрарганізацыях ёсьць павадыры, якія не зацьверджаны РК КСМ. Гэта якраз мае месца і ў маім піонэратрадзе.

Уся бяда ў тым, што недаацэньваецца роля піонэрарганізацыі. Піонэрарганізацыі стаяць у баку ад праводзімых кампаній. Лепшыя комсамольцы не мобілізаваны на піонэрпрацу. Ня гледзячы на праведзеную ўжо мобілізацыю, для палепшаньня піонэрскай работы, трэба ізноў правесьці мобілізацыю.

Пытаньне аб кадрах у нас стаіць вельмі востра.

Грамадзкія арганізацыі недаацэньваюць ролю піонэрарганізацый. Калі прыходзіцца ўключаць сродкі на выдаткі на піонэрработу, дык РК заўсёды супроцьдзейнічае. ЦБ трэба вышукаць фонды для таго, каб магчыма было на мясцох арганізаваць курсы па падрыхтоўцы павадыроў.

ЦБ ДКО не кіравала

Іопраўнікава.—Сёньня трэба гаварыць аб недастатковым кіраўніцтве з боку цэнтральнага бюро. Дырэктывы нам пішуць, прысылаюць гэтыя дырэктывы разам з дырэктывамі райкому ў сакрэтных пакетах, але ўсё гэта толькі пратаколы. Трэба сказаць, што тыя матар'ялы, якія нам шлюць, напрыклад, аб колгасна-вытворчым паходзе і г. д., яны проста не прыстасаваны да дзіцячага ўзросту, яны проста капіруюцца з пастаноў цэнтральнага камітэту. Цэнтральнае бюро павінна праверыць склад работнікаў, замацаваць іх, правесьці курсы і тады можна будзе наладзіць працу.

Курсы актыву не далі добрых вынікаў

Эбэльштэйн. Робячы агляд у Чашніках, выявілі, што ў нас амаль усе комсамольцы з 1930 г. у комсмоле і ёсьць адзін кандыдат.

Калі пачынаеш шукаць па ячэйках, дык некага вылучыць павадыром атраду.

Некалькі слоў аб старшынях раённых бюро. Былі ўтвораны курсы піонэрработнікаў, я таксама быў на іх. На курсы былі вылучаны маладыя таварышы, у большасьці 1929 г. уступленьня ў комсамол. Прычым 15-20 проц. гэтых таварышоў проста няпісьменныя.

І вось такім чынам, у працягу пэўнага кварталу прыходзіцца работнікаў мяняць. Калі мы паглядзім, які процант піонэрработнікаў быў на курсах, дык я ня ведаю, ці набярэцца тут 15%. Як-жа можна арганізаваць пры такіх умовах піонэрработу?

У падарунак комсамольскім зьездам

МАГУТНЫ ЭШАЛЁН ПАЙШОЎ

Сіламі комсамольцаў Віцебскага, Сіроцінскага, Лёзьненскага і Гарадоцкага раёнаў організаваны і накіраваны ў Ленінград магутны эшалён у 80 ВАГОНАЎ БУЛЬБЫ

ВІЦЕБСК, 22. 20 га кастрычніка на Ленінград пайшоў падарунак комсамоліі Віцебшчыны — эшалён бульбы ў складзе 80 вагонаў.

Толькі тыдзень таму назад была падхоплена гаркомам і чатырма вясковымі райкомамі комсамолу ініцыятыва комсамольцаў-чыгуначнікаў.

Грузім бульбу

Гэты тыдзень організацыі эшалёну быў тыднем сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў. Не на словах, а на справе комсамольцы гораду Віцебска, Сіроцінскага, Лёзьненскага і Гарадоцкага раёнаў мобілізаваліся на правядзеньне работы па арганізацыі эшалёну.

850 чалавек з гарадзкой арганізацыі былі кінуты ў саўгасы і колгасы на ўборку бульбы.

50 актывістых выехалі ў вёску для правядзеньня сходаў сялян організацыйнай работы па нарыхтоўках.

50 чалавек рабочай моладзі і пролетарскага студэнцтва гораду былі перакінуты на пагрузку бульбы. У выніку гэтай напружанай работы нарыхтавана каля 100 вагонаў бульбы, з якіх 80 вагонаў ідзе комсамольскім эшалёнам.

Дарадзел, у асобе яго загадчыка Гамера і памочніка Мец, сарваў абяцаную дастаўку брыгадзіраў з колгасаў. 200 вучняў прымушаны былі іісьці пехатою 16 кілёмэтраў.

Начальнік 6-га раёну МББ чыгункі—Джаджа бяздушна адносіўся да організацыі эшалёну: па 20 раз на дні мяняў свае загады,—то загадваў, то забараняў некаторым комсамольцам ехаць на правядзеньне работы па організацыі эшалёну.

Дырэкцыя МББ чыгункі па-дзяляцку падышла да справы сьледваньня эшалёну, забараніўшы ехаць „на сваім“ паравозе па вучастку Кастрычніцкай чыгункі. Прышлося паслаць тэлеграмы сэкратару ЦК УсеЛКСМ Салтанаву і Наркамшляху Рухімовічу.

Наадварот,—памоцнік начальніка раёну,—Нарыйка, прымаў самы гарачы ўдзел у організацыі эшалёну.

Шофэры паштова - тэлеграфнай канторы, т. Данкевіч і інш, не зважаючы на тое, што іх рабочы час даўно скончыўся, да 1 гадзіны ночы перавозілі брыгаднікаў. ЦРК організавала баявое забясьпечаньне харчаваньнем брыгаднікаў ня толькі ў Віцебску, але і ў Замасточчы, Лосьвіцах і Сялянцы.

Комсамольцы чыгуначнікі ў звышурочны час па-ўдарніцку выпусьцілі з бягучага рамонту раней тэрміну паравоз № 5330 сэр. „9“, паказаўшы гэтым прыклад старым рабочым.

Брыгада эшалёну складзена з комсамольцаў-ударнікаў, прэміяваных рабочымі за посьпехі. Галоўным кандуктарам едзе т. Блісмановіч, які атрымаў тры прэміі.

Цягнік дэкараваны ўдарнай брыгадай студэнтаў мастацкага тэхнікуму.

М. САБЕЦКІ.

РАПАРТЫ З ФРОНТУ БУЛЬБЫ

МАЗЫР, 25 (па тэлеграфу). Адпраўлен комсамольскі эшалён бульбы ў 30 вагонаў. Азарыцкі раён ня выканаў заданьня на 18 вагонаў.

Ужыты захады да адпраўкі другога эшалёну.

КАЛІНКОВІЧ.

АСІПАВІЧЫ, 25 (па тэлеграфу). Работа па падрыхтоўцы да пагрузкі комсамольскага эшалёну бульбы ў поўным разгары. Брыгады працуюць ударна. Нарады на вагоны будуць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін. Бульба часткова знаходзіцца на пунктах адгрузкі.

Колькасьць загатоўленай бульбы забясьпечыць 100 проц. выкананьне заданьня.

Эшалён фарміруецца і накіроўваецца ў Донбас.

Упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ ЯКУБОВІЧ.

ВЕРНЕМ КРАІНЕ ЛЯСНЫ ДОЎГ

Бюлетэнь барацьбы за прамфінплян лесазаводу № 13
Выдаецца адзін раз у пяцідзёнку

№ 6 Менск—Віцебск № 6

На Віцебскім лесазаводзе № 13 зараз вядзецца баявая праца па аднаўленьню і пуску заводу. Але побач з гэтым ёсьць закінуты вучастак працы. Каля 150 плытоў лесу яшчэ засталіся на вадзе і набліжэньне зімы стварае пагрозу замярзаньня лесу.

Неабходна прыняць рашучыя захады для палепшаньня працы біржы лесу з тым, каб як мага лепей скарыстаць час, які яшчэ застаўся для ліквідацыі прарыву.

Чыя віна?

Зараз-жа пасьля аварыі на лесазаводзе № 13, 3-га кастрычніка была выклікана камісія з прадстаўнікоў РСІ і інжынэраў. Камісія дэталёва абсьледвала месца і прадметы разбурэньня і знайшла, што прычыны аварыі крыюцца ў слабой кладцы фундаманту, які рабіўся ў 1928 годзе, у мароз. Занадта кароткімі аказаліся балты, усяго 400 мм даўжынёй, а акрамя таго была розьніца ў нацяжцы рамнёў у розныя бакі. Усё гэта разам узятае расхістала нятрывалы фундамант, вырвала балты, узарвала падшыпнікі, вал сарваўся з свайго месца і разьбіў на хаду шківы.

Пасьля катастрофы 7-га кастрычніка зноў выкліканая камісія устанавіла, што галоўнай прычынай аварыі другой трансмісіі зьяўляецца яловая закладка з вядучага шківа. Прарэзаная балтамі накладка адарвалася ад шківа і папала пад рамень.

Самы шкіў, вобад якога прасьвідраваны дзіркамі для балтоў, ня меў вялікай моцы і разьляцеўся ад удару накладкі, разбураўшы сваімі абломкамі шкіў рамы № 1. Галоўны вал пагнуўся і раскалоўся трывалы фундамант, які рабіўся ў 1916 годзе.

Камісіі скончылі сваю працу. Але на заводзе, у цэхах, ходзяць розныя чуткі аб прычынах аварыі і хто за яе павінен адказваць.

Неабходна самае тэрміновае і дасканалае расьсьледваньне вышэйпаданага. Трэба выцягнуць чуткі і гутаркі з куткоў на сьвет, на суд грамадзкасьці.

Рабкораўскі пост ХОДАРАЎ, РЫЖЫ.

За хутчэйшую ліквідацыю вынікаў аварыі

Перад тварам шматлюднай нарады, скліканай па пытаньню аварыі на заводзе, праходзяць факты расхлябанасьці і ўпушчэньняў мэханічнага цэху. Мэханік рэдка аглядаў трансмісіі, у трансмісійным аддзяленьні няма патрэбнага асьвятленьня. Выказваецца меркаваньне, што вядучы шкіў разьляцеўся таму, што ня быў умацаван балтамі ў абсалютным злучальным прылве.

Зэймэрн фундамант на контрпрыводзе даў расколіну, але гэта не паслужыла сыгналам для мэханічнага цэху, які не паклапаціўся агледзець і праверыць астатнія трансмісійныя фундаманты.

З шэрагу хібаў мэханічнага цэху выяўляецца галоўная прычына аварыі.

Думкі выказаныя шэрагам рабочых і інжынэрам Вахно сходзяцца на тым, што прычына аварыі—у трасмісійных фундаментах, якія клаліся ў маразы 1928 г. на пяшчанай, рассыпчастай глебе і мала апушчаны ў зямлю. З ліку адрытых фундамантаў знойдзена, што ў зямлю яны апушчаны ўсяго на 500 м-м, што для пяшчанай глебы невыстарчальна.

Вытворчая нарада, разабраўшы ўсе гэтыя пытаньні, адзначыла, што з прычыны аварыі мы не выпрацавалі 7000 к-м. піло матар'ялаў якія ва што-б там ні стала павінны зьвярнуць краіне.

Нарада пастанавіла:

Працаваць ва ўсе дні сьвят, поўных 7 гадзін адпрацаваць у адзін з нядзельных дзён—у пэрыод асобага кварталу.

Нарада вынесла шэраг практычных мерапрыемстваў папярэджаньню ў будучым падобных аварый.

І ёсьць упэўненасьць што напружаньнем усіх сіл, волі, энэргіі і нястомным творчым энтузіязмам усіх рабочых і служачых вынікі аварыі, якія нанесьлі краіне велізарныя страты, будуць ліквідаваны.

Рабкораўскі пост—Ходараў, Рыжы.

Тут небясьпечна

Хутка зіма. Мароз ня прымусіць сябе доўга чакаць. Але на біржы бярвеньняў ня прыкметна пералому, няма зрухаў з чарапашых тэмпаў па выгрузцы лесу. Усяго выцягнута на 12-X—2600 куб. мэтраў сыравіны, а 14500 куб. мэтраў, прыкладна — 30 проц, засталося ў вадзе.

Элеватары стаяць цэлымі днямі з-за нявыхаду рабочых на работу. Сэзонныя рабочыя выпаўляюць часам рвацкія патрабаваньні.

Завком і парт'ячэйка мала цікавяцца выгрузкай лесу. Сярод рабочых сэзоньнікаў не вядзецца ніякай культурна-выхаваўчай работы.

3-яя зьмена—бяспрытульная. У час яе працы рабочыя разьбягаюцца спаць, ня слухаюць дзесятнікаў, элеватары стаяць.

Вакол выгрузкі лесу не мобілізавана грамадзкасьць. Перад рабочым колектывам заводу не пастаўлена ва ўсю шырыню пытаньне аб выгрузцы бярвеньня.

Пасьля спыненьня заводу з прычыны аварыі, частка рабочых корпусу была кінута на выгрузку бярвеньня, але працаваць на элеватарах ніхто з корпусных рабочых не застаўся,—усе разьбегліся. Гэта гаворыць за тое, што рабочыя дагэтуль не разумеюць важнасьці пытаньня выгрузкі бярвеньня. На заводзе організавана брыгада па праверцы прычын простояў. Брыгада выявіла, што вялікі процант прастояў падае на лік біржы бярвеньняў з-за несвоечасовай падачы лесу ў басэйн. Рамы стаяць цэлымі гадзінамі і ні берагавая адміністрацыя, ні рабочыя берагу ня дбаюць аб гэтым.

22-X рамы прастаялі 1 гадзіну, бо дзесятнік Маскалёў не пасьпеў своечасова падаць лес. Запэўніваньні заводакіраўніцтва, што яно не дапусьціць ні аднаго простою ня зьдзейсьніліся на практыцы. Прастоі рам да гэтага часу працягваюцца.

Бясчынствы, якія існуюць у забясьпечаньні заводу сыравінай, пагражаюць зрывам прамфінпляну.

Чарапашыя тэмпы выгрузкі пагражаюць замарозіць бярвеньні ў рацэ

Усяму трыкутніку неабходна ўдзяліць найсур'ёзьнейшую ўвагу выгрузцы лесу.

Момілізаваць сябе і рабочую масу на справу выгрузкі.

Усё бярвеньне павінна быць выгружана да наступленьня маразоў.

Рабкор Мярзьляк.

ІСКРЫ РАДЫЁ

Адкрытае прызнаньне „Бэрлінэр Тагеблят“

БЭРЛІН, „Бэрлінэр Тагеблят“ прысьвячае забастоўцы бэрлінскіх мэталістых артыкул. Артыкул зьяўляецца добрай ілюстрацыяй настрояў буржуазіі, якая адчувае жах перад ростам рэволюцыйнай баявой магутнасьці рэволюцыйнай профопозыцыі. „Бэрлінэр Тагеблят“ піша:—„У новым складзе трацейскай камісіі большасьць, уключаючы прадстаўнікоў прадпрыемстваў, бязумоўна выкажацца за 5 проц. зьніжэньне зарплаты. Аднак, схіліць профсаюзы да гэтага наўрад ці давядзецца, дзякуючы наяўнасьці сільнай опозыцыі. Калі трацейскае рашэньне будзе аб'яўлена абавязковым, дык саюз мэталістых(рэформісцкіх) закліча рабочых, якія зьяўляюцца членамі саюзу, да аднаўленьня работы. Гэтага моманту баяцца нават самыя ўпэўненыя супрацоўнікі організованай па-за саюзу забастоўкі, бо корэктныя паводзіны профсаюзу пры сучасным палітычным становішчы пацягнуць за сабою масавы выхад рабочых з саюзу.

Рэволюцыйная опозыцыя, якая рыхтуецца да далейшага кіраўніцтва забастоўкай, выкарыстоўваючы дакор у здрадніцтве інтарэсам рабочых, можа прывесьці ў рух ня толькі вялікую армію організаваных рабочых, але і разьлічваць на сільны наплыў шэрагаў, у сучасны момант яшчэ не організаваных рабочых“.

ПАД ФАШЫСЦКІМ БОТАМ

Пасьля пагрому ў галоўнай управе т-ва беларускай школы, калі было арыштавана звыш 140 асоб, штодня адбываюцца дадатковыя арышты. Так, уноч з 22 на 23 паліцыя зрабіла вобыск у доктара Марціньчыка і сярод шэрагу рабочых.

* „Дзеньнік Віленскі“ паведамляе, што палітычная паліцыя наладзіла масавыя аблавы ў Дзісьненскім і Вялейскім паветах. Па папярэдніх даных арыштаваны ў Вялейскім павеце звыш 20 асоб, пераважна члены таварыства Беларускай школы.

* Польскі друк паведамляе, што ў Драгабычу, Львоўскага павету, арыштаваны былы пасол украінец Янка Блашкевіч.

* У Багарачанах (павятовы горад) учынены масавыя аблавы і арышты. У Самборы арыштаваны былы пасол Мікалай Рагуцкі.

ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ“

Прывітальная тэлеграма

11-я раённая конфэрэнцыя комсамолу Талачыншчыны перадае сваё шчырае комсамольскае прывітаньне ад ім паўтысячнае арміі комсамольцаў.

Райконфэрэнцыя запэўнівае ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМ што пад кіраўніцтвам партыі і Цэнтральнага Камітэту комсамолу комсамольская організацыя Талачыншчыны, уступаючы ў трэці рашаючы год пяцігодкі, мобілізуе ўсе свае сілы і энэргію на справу актыўнага ўдзел ў соцыялістычным будаўніцтве, на выкананьне пяцігод ў чатыры гады.

Конфэрэнцыя запэўнівае, што комсамольская орган зацыя пад кіраўніцтвам партыі будзе праводзіць бязьл тасную барацьбу супроць ухілаў ад гэнэральнай лі партыі і ў першую чаргу супроць правага ўхілу як найбол неаясьпечнага на даным этапе соцбудаўніцтва і прым рэнцтва да яго.

Няхай жыве комуністычная партыя і яе бальш віцкі ЦК!

Няхай жыве ЦК ЛКСМБ!

Няхай жыве „Чырвоная Зьмена“!

Прэзыдыум райконфэрэнцыі.

Адказны рэдактар—Рэдколегі

Паведамленьні

26 кастрычніка, роўна а 6 гадзіне ўвечары, адбудуцца справаздачныя куставыя сходы ячэек ЛКСМБ Фрунзэўскага раёну ў наступных клюбах:

1. Клюб друкароў—ячэйкі: друкарні Сталіна, мэталістых, шорнай ф-кі, друкароў саюзных, шпалернай фабрыкі, п-к Уціль, Эльводу, тэкстыльнай ф-кі, працасьветы, рэдакцыі газэт, ВСНГБ, НДІ, 2-хгадовых пэдкурсаў, Бэлпэдтэхнікуму, Муэтэхнікуму, горных курсаў, зав. дрэваапрацоўшчык, друкарні „Зьвязды“.

2. Клюб гарсавету—ячэйкі: „Комунара“, Яўпэдтэхнікуму, скарняжнай, „Беларускі“, Аўтатранспарту, ФЗВ, ...нікаў, ф-кі „8-е сакавіка“, Полі...куму, Курасоўшчыны, Профш... краўцоў, ф-кі „Акцябр“, Нарс... Белдзяржкіно, Дзяржпляну.

3. Клюб харчавікоў—ячэйкі: дзяржбуду, „Комунаркі“, 2 харчводаў, Нархарч сталовых, груп... харчавікоў, міліцыі, Наркамга... комгасу, Хлебазаводу, мэдсанп... Абкомтрэсту, ВЗО, Аўтатэхні... Польпэдтэхнікуму, усе сав... ячэйкі.

4. Клюб будаўнікоў—ячэйкі: будтрэсту, будаўнікоў, профш... будаўнікоў, Белжылсаюзу, усіх ...гельных заводаў.

29-X—30 г., а 6-й гадзіне ўве... адбудзецца пасяджэньне ЦКК, на... выклікаюцца наступныя т. т. ...шчэнка, Сімкін, Серафімовіч, ...шэін, Арцімовіч, Філончык В., ...Н., Нікалаевіч П. С., Шыркев... Верацэнка, Кукін, Пучкаеў Я., Халановіч Д., Шаройкін, Дзе... Кольчаў В., Пісарэвіч М. П., Ка... сон С., Ліповіч Р., Фамін В., Б... скі, Караткевіч С. В., Кушнэр Х., Шыдлоўскі Н. В., Міхальскі Я., Смарадзінскі Я. А., Іофэ, Рэлін, Малахоўскі, Ангайбэр Ц., Рынко... і Жоўцік С. А.

Праезд за свой кошт.

ЦКК ЛКС...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 59...